# Вызваленне

20 верасня 1943 г. Стаўка Вярхоўнага галоўнакамандавання паставіла задачу перад Бранскім фронтам — выйсці на Сож 2–3 кастрычніка і затым разгарнуць наступленне на паўночны захад, у фланг групы арміі «Цэнтр». Выконваючы гэту задачу, войскі Бранскага фронту працягвалі развіваць паспяховае наступленне, уступілі ў межы Беларускай ССР і «прасунуліся ўперад ад 15 да 25 кіламетраў, авалодалі раённым цэнтрам Магілёўскай вобласці Хоцімск 26 верасня 1943 года» (аператыўная зводка Савецкага інфармбюро за 26 верасня 1943 г.; «Правда», 1943 г., 27 верасня).

У вызваленні Хоцімска непасрэдны ўдзел прымалі 110-я стралковая дывізія ў складзе 1287-га, 1289-га і 1291-га стралковых палкоў, 971-га артылерыйскага палка 200-га знішчальнага супрацьтанкавага дывізіёна, 108-я стралковая дывізія ў складзе 407-га, 444-га і 539-га стралковых палкоў, 576-га артылерыйскага палка і 152-га асобнага знішчальнага супрацьтанкавага дывізіёна. 108-я і 110-я стралковыя дывізіі ўваходзілі ў састаў 50-й арміі Бранскага фронту. Аператыўнае кіраўніцтва ў вызваленні Хоцімска і раёна здзяйсняў камандуючы 50-й арміі Бранскага фронту генерал-палкоўнік І.В. Болдзін, начальнік штаба генерал М.Р. Брылёў і член Ваеннага Савета А.М. Карамышаў.

Фашысты любой цаной імкнуліся не дапусціць часці Чырвонай Арміі да граніц Беларусі. Выхад на рубяжы Беларусі і падрыхтоўка наступлення па яе вызваленні мелі вялікае маральнае значэнне для воінаў Чырвонай Арміі, у складзе якой знаходзіліся тысячы воінаў-беларусаў, якія з асаблівым нецярпеннем чакалі часу, калі пачнецца вызваленне іх роднай, шматпакутнай Беларусі. Гэта добра разумела і камандаванне нямецкіх войск. На рубяжах Беларусі былі сканцэнтраваны вялікія сілы фашыстаў. Таму дывізіі Чырвонай Арміі сустрэлі тут шалёнае супраціўленне нямецкіх дывізій. Асабліва ўпартае супраціўленне немцы аказалі ў паласе наступлення 108-й і 110-й стралковых дывізій 50-й арміі, якімі камандавалі гвардыі палкоўнік П.А. Церамаў і палкоўнік С.М. Тарасаў. Аператыўная зводка 108-й стралковай дывізіі за 24 верасня 1943 г. паведамляла, што дывізія к 12 гадзінам 23 верасня з баямі выйшла на рубяжы Малой і Вялікай Ліпаўкі, Узлог, Чарняўкі. 407-ы, 444-ы (камандзір маёр Ягор Давыдавіч Гасан) і 539-ы стралковыя палкі сустрэлі на гэтым рубяжы агнявое і танкавае супраціўленне праціўніка і вымушаны былі спыніць наступленне. Дывізія страціла ў гэты дзень 24 чалавекі забітымі і 113 параненымі. Немцы страцілі больш як 150 салдат і афіцэраў. 24 верасня 108-я дывізія працягвала баі за Вялікую і Малую Ліпаўку, Узлогі, 539-ы стралковы полк раніцай 24 верасня атакаваў праціўніка ў Малой Ліпаўцы, аднак, сустрэўшы супраціўленне да дзвюх рот пяхоты і моцны артылерыйска-мінамётны агонь фашыстаў, замацаваўся паўночна-ўсходней і ўсходней Малой Ліпаўкі, 444-ы стралковы полк к 7 гадзінам раніцы з боем авалодаў вёскай Узлогі. Аднак фашысты кінулі ў контратаку да 200 салдат і чатыры танкі і зноў адбілі Узлогі. Полк вымушаны быў замацавацца паўднёва-ўсходней в. Вялікая Ліпаўка і ўсходней Узлог. Дывізія страціла за гэты дзень 10 чалавек забітымі і 24 — параненымі.

Адначасова 25 верасня да вёскі Гаўрылоўка, фарсіраваўшы р. Іпуць, падышлі часці 324-й стралковай дывізіі пад камандаваннем палкоўніка Эрнеста Жанавіча Сядуліна. Раніцай 25 верасня часці дывізіі пасля жорсткага бою збілі праціўніка на падыходах да Гаўрылоўкі, які абараняўся сілаю да двух батальёнаў пяхоты, умацаванай шасцю артылерыйскімі батарэямі і групамі самаходных гармат. Фашысты тройчы спрабавалі выбіць нашых байцоў контратакамі, аднак 1093-і стралковы полк рашуча адбіваў гэтыя атакі, наносячы ворагу адчувальныя страты. Страціўшы каля 200 салдат і афіцэраў, немцы пачалі адступленне, пакінуўшы вёску Гаўрылоўку. 26 верасня 1943 г. 108-я, 110-я і 380-я стралковыя дывізіі, якія атрымалі задачу наступаць на Хоцімск, у выніку сумесных дзеянняў, пераадольваючы супраціўленне ворага, разгарнулі наступленне на Малую і Вялікую Ліпаўку, Узлогі. К 4 гадзінам 40 хвілінам 1289-ы стралковы полк 110-й дывізіі марской пяхоты авалодаў Вялікай Ліпаўкай, а к 5 гадзінам 1287-ы полк гэтай жа дывізіі выбіў ворага з Узлог. К 7 раніцы часці 110-й дывізіі падышлі да Хоцімска. Наступленне на Хоцімск з усходняга боку прывяло да вялікіх страт асабовага складу дывізіі. Таму ад 1287-га і 1289-га палкоў былі выдзелены групы аўтаматчыкаў з задачай прабрацца па рэчках Жадунь і Альшоўка і выйсці на заходнюю і ўсходнюю ўскраіны Хоцімска.

К 8 раніцы ўзвод аўтаматчыкаў 1287-га палка выйшаў на ўскраіну Хоцімска. У гэты ж час усе стралковыя падраздзяленні пачалі наступленне на ўсходнюю ўскраіну Хоцімска.

У гэты час перадавыя атрады і кавалерыйскі эскадрон 108-й дывізіі ўжо ўварваліся ў гарадскі пасёлак і вялі баі за кожны дом і вуліцу разбуранага і спаленага фашыстамі пасёлка. У хуткім часе падышлі і асноўныя сілы 108-й дывізіі. Баі на падступах да Хоцімска каштавалі 108-й дывізіі немалых страт. За два дні (25 і 26 верасня) паводле аператыўных даных штаба дывізіі загінула 85 і было паранена 160 нашых салдат і афіцэраў. Часці 324-й стралковай дывізіі к 14 гадзінам 26 верасня выйшлі на рубяжы вёсак Васілеўка, Малуноўка і Абшчына, а да канца дня — да в. Забялышына. Дывізія за час баёў 25 і 26 верасня страціла 24 чалавекі забітымі і 49 параненымі.

На долю 380-й Арлоўскай стралковай дывізіі пад камандаваннем палкоўніка А.Ф. Кустава выпала вызваленне вёсак Варвараўка, Чарняўка, Бяседавічы, Прудок, Баханы, Уладзіміраўка, Юзяфоўка, Благоўка, Клін, Янава. Найбольш упартае супраціўленне на гэтым участку вораг аказаў пры вызваленні вёсак Варвараўка і Чарняўка. Яшчэ 24 верасня 1264-ы стралковы полк падышоў да в. Варвараўка і паспрабаваў абысці яе злева ў раёне пасёлка Міхайлаўскі, аднак, сустрэўшы моцны ружэйна-кулямётны і артылерыйска-мінамётны агонь праціўніка, наступленне спынілася. Пасля перагрупоўкі другі стралковы батальён з правага боку павёў наступленне праз лес у напрамку Варвараўкі. Трэці стралковы батальён наступаў з паўднёвага ўсходу. Праціўнік адкрыў моцны агонь, і нашы байцы вымушаны былі залегчы і акапацца. Толькі к 21 гадзіне вечара было зламана ўпартае супраціўленне ворага і вызвалена Варвараўка. У гэтым баі асабліва вызначыліся камандзіры гармат Фаменка і Садыкаў. У выніку бою за Варвараўку было знішчана да двух узводаў пяхоты праціўніка, тры кулямётныя кропкі, 37-міліметровая гармата. 1264-ы полк страціў у гэтым баі 9 чалавек забітымі і 58 параненымі.

Працягваючы наступленне пры ўзаемадзеянні з 186-й дывізіяй 380-я дывізія ачысціла ад ворага вёскі Благоўка, Юзяфоўка, Дубраўка, Гутары, пасёлкі Чырвоная Зара, Казарына, Зара Свабоды, Марозаўшчына. 27 верасня дывізія праследавала праціўніка і к 23 гадзінам выйшла на рубеж Муравілле, Карбанава Касцюковіцкага раёна. Баявыя падраздзяленні 186-й стралковай дывізіі пад камандаваннем генерал-маёра Равуненкава 26 верасня 1943 г., зламаўшы ўпартае супраціўленне ворага каля вёскі Горня, атрымалі задачу весці наступленне па маршруту Баханы, Яленаўка, Бярозкі, Ігнатаўка, Ганнаўка, Арцюхоўка, Загор’е, Карбанава, Муравілле.

У гэтай жа паласе наступалі часці 283-й стралковай дывізіі, але найбольш левым флангам. 26 верасня 1943 г. к 16 гадзінам часці 186-й дывізіі авалодалі вёскамі Баханы, Благоўка, Бярозкі, Роскаш, Уладзіміраўка, страціўшы за дзень 6 чалавек забітымі і 29 параненымі. 27 верасня дывізія працягвала праследаваць нямецка-фашысцкія часці, пачаўшы наступленне ў 2 гадзіны ночы. Да 12 гадзін часці 186-й дывізіі выйшлі на межы Касцюковіцкага раёна, вызваліўшы вёскі Чарняўка, Максімаўка, Арцюхоўка, Загор’е, Сакалоўка. Часці 324-й стралковай дывізіі пасля вызвалення Гаўрылоўкі, Елаўца, Багданаўкі, Васілеўкі, Малуноўкі, Абшчыны працягвалі наступленне і занялі вёску Бруеўка. Тут іх з Чырвоным сцягам сустрэў жыхар вёскі Бруеўка Агей Ягоравіч Васільчанка. Гэты калгасны сцяг ён збярог у гады нямецкай акупацыі. У вёсцы адбыўся мітынг, дзе жыхары шчыра віталі сваіх родных вызваліцеляў.

27 верасня часці дывізіі прайшлі Маркаўку, Трасціно, Забялышына і выйшлі да 16 гадзін на рубеж в. Леанаполле. У гэтым жа напрамку па маршруту Хоцімск–Галееўка, Трасціно–Хацімча 27 верасня рабіла марш 108-я стралковая дывізія, якая к 17 гадзінам размясцілася ў раёне в. Забялышына.



Я.І.Іваноў, камандзір 108-й стралковай дывізіі.



А.Ф.Кустаў, камандзір 380-й стралковай дывізіі.

110-я стралковая дывізія пасля баёў за Хоцімск вяла наступленне па маршруце Канава–Марцінаўка і да 22 гадзін 30 хвілін выйшла на рубеж Запруддзе–Селішча–Чарняўка, сустрэўшы агнявое супраціўленне фашыстаў на падыходах да вёсак Ельня і Андронаўка. Тут часці дывізіі былі абстраляны прамою наводкаю з «фердынандаў». На долю воінаў 413-й стралковай дывізіі выпала задача вызваляць вёскі Ціхані, Арлоўка, Падлесная, Буда, Гарадок, Таклеўка. Дывізія 27 верасня 1943 г. к 6 гадзінам раніцы выйшла да в. Сакалоўка Клімавіцкага раёна. Вёскі Ветка, Батаева, Князёўка, Ліпакі, Арол, Яленаўка, Іўкіна і прылеглыя да іх былі вызвалены часцямі 283-й і 269-і стралковых дывізій. Так завяршылася вызваленне ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў першага на Беларусі раёна, цэнтр якога Хоцімск быў ператвораны ў моцны апорны пункт. Перамога савецкім воінам далася нялёгка. Пры вызваленні Хоцімска ў баях загінулі больш як 190 воінаў, якія мужна змагаліся за кожны метр беларускай зямлі. Сярод вызваленцаў былі нашы землякі: Настасся Усцінаўна Сёмачкіна, Фёдар Максімавіч Каржукоў, Я.К. Захарэнка, Масяйкоў.

Палонныя мінамётчыкі паказалі, что гадзіну назад з Хоцімска выведзена калона грамадзянскага насельніцтва, больш за трыста чалавек, у асноўным жанчыны, моладзь. Паставілі задачу: дагнаць і вызваліць палонных!

Хто ж быў героем наступальных баёў за Хоцімск?

Камандзір 108-й стралковай дывізіі А.П. Церамаў у ваенных мемуарах «Палаючыя берагі» адзначае: «У баях за Хоцімск вызначыліся Краўчанка, Цхакадзе, Пляшкоў». Што рабілі ў баі гэтыя людзі?

Лейтэнант Краўчанка камандаваў штурмавой групай. Нямецкі кулямётчык перакрыў вуліцу агнём. Лейтэнант смелым кідком наблізіўся да дома, ручнымі гранатамі знішчыў агнявую кропку. Яго група рухалася далей і далей. Потым камандзір упаў паранены. Парторг роты Цхакадзе і кулямётчык Пляшкоў адцягнулі яго ва ўкрыцце. Парторг узначаліў групу. Вярнуўся Пляшкоў, пакінуўшы лейтэнанта ў падвале пад наглядам мясцовых жыхароў, сваім агнём стаў падтрымліваць аўта матчыкаў. З паддашка ўдарыў кулямёт. Парторг даў сігнал танку і ўказаў цэль. Наводчык першым стрэлам разнёс увесь дах дома разам з кулямётам.

Хоцімск быў вызвалены 26 верасня да 18.00. Тут было знішчана каля двух батальёнаў пяхоты, каля ста гітлераўцаў здаліся ў палон.

Сорак аўтаматчыкаў былі пасаджаны на тры танкі дагнаць угнаных з Хоцімска савецкіх людзей. За пяць кіламетраў ад Хоцімска камандзір стралковай роты старшы лейтэнант Міхаіл Парфір’евіч Яворскі дагнаў калону. Танк даў два стрэлы ўздоўж дарогі — справа і злева. Ахова кінулася ўрассыпную. Два танкі падышлі да калоны. Сустрэча была кранальнай. Жанчыны са слязамі радасці абдымалі савецкіх салдат. Хто не мог праціснуцца, той цягнуўся і ласкаў рукою замаслены, дарагі і мілы рускі шынель.

Кранальнай была карціна і ў цэнтры горада. Некалькі сотень жыхароў і байцоў змяшаліся, плошча гудзела, як магутны вулей. Вакол усё яшчэ напаміналa пра бой: раскрытыя вокны, пабітыя асколкамі і кулямі сцены, зброя гітлераўцаў і іх трупы пад нагамі. Але ўсе гэтыя цяжкія падрабязнасці вайны адступілі, людзі іх зараз не заўважалі, яны бачылі іншы твар вайны — вызваленне. Яно было прыгожым. Абдымкі, радасць, слёзы. І ў даваршэнне павольна падышлі тры Т-34 з групы Яворскага. На іх не было аўтаматчыкаў. На іх бранi былі дзеці, якіх нядаўна гналі ў мацi на руках фашысцкія вылюдкі. Дзеці былі худыя і абарваныя. Але колькі шчасця ў іх ззяючых вачах!

У Хоцімск прыехалі прадстаўнікі Цэнтральнага Камітэта Камуністычнай партыі Беларусі і ўрада рэспублікі. Адбыўся мітынг. Калі аркестр грымнуў «Інтэрнацыянал», слёзы пацяклі па змардаваных тварах хацімчан. 770 дзён яны не чулі пралетарскага гімна. Сакратар Кампартыі Беларусі П.К. Панамарэнка ўзняў руку і загаварыў: «Учора сталіца нашай Радзімы салютавала войскам Савецкай Арміі, якія вызвалілі ад нямецкіх акупантаў Смаленск і Рослаўль. А сёння, 26 верасня, увесь наш народ даведаўся аб вызваленні першага раённага цэнтра на беларускай зямлі — Хоцімска. Выгнанне гітлераўцаў з Беларусі пачалося!»

У гады Вялікай Айчыннай вайны працоўныя Хоцімшчыны прынялі актыўны ўдзел у барацьбе з фашыстамі. На франтах і ў партызанскай барацьбе загінулі звыш чатырох тысяч жыхароў Хоцімшчыны, 800 мірных жыхароў сталі

ахвярай фашысцкай агрэсіі. Гітлераўцы вывезлі з Хоцімска і вёсак на катаргу ў Германію савецкіх грамадзян, разлучаючы сем'і, дзяцей, братоў і старых.

Многія хацімчане вызначыліся ў баях і былі ўзнагароджаны высокімі ўзнагародамі, а двое землякоў, паказаўшы бязмежную адданасць Радзіме і праявіўшы мужнасць і гераізм у барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў, былі ўдастоены вышэйшай узнагароды — звання Героя Савецкага Саюза: гэта генерал-лейтэнант М.К. Піліпенка і Я.Я.Сусько — лётчык, потым Паўнамоцны пасланнік СССР, поўныя кавалеры ордэна Славы І.Т. Ляскоўскі, С.А. Лупікаў; К.С. Яфрэменка паўтарыў подзвіг Мікалая Гастэлы, накіраваўшы палаючы самалёт на нямецкія ваенныя караблі ля Севастопаля. Зараз адна з вуліц Севастопаля носіць імя нашага земляка Карнея Сямёнавіча Яфрэменкі, які загінуў 13 красавіка 1944 г.

На 23-м годзе жыцця загінуў верны сын Савецкай Радзімы гвардыі капітан Пётр Апанасавіч Чапёлкін. Пад Ленінградам ён зрабіў 215 баявых вылетаў і знішчыў трынаццаць варожых самалётаў. Загінула Марыя Маскалёва, разведчыца, снайпер-радыстка. Ворагі здзекаваліся з яе, жадаючы атрымаць ваенную тайну, але Марыя засталася вернай прысязе, паўтарыўшы подзвіг Зоі Касмадзям'янскай.

Барацьба супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў мела інтэрнацыянальны характар. У французскім руху Супраціўлення ўдзельнічаў Васіль Мяшкоў, ураджэнец вёскі Дружба Хоцімскага раёна. 28 мая 1944 г. з канцлагера «Муана дэ Мерар», размешчанага непадалёку ад горада Муі, дэпартамент Уаза, уцяклі чацвёра ваеннапалонных: Васіль Мяшкоў, двое рускіх і эстонец. За дзесяць дзён яны змаглі з дапамогай французскіх сяброў сфарміраваць партызанскі атрад з савецкіх людзей — «Ягуар». Спачатку ў атрадзе было 62 чалавекі, затым ён павялічыўся. Камандзірам выбралі В. Мяшкова. Адной з найбольш вядомых аперацый атрада з'явіўся разгром фашысцкай радыёлакацыйнай станцыі пад Клермонам, якая карэкціравала запуск і палёт ракет «Фау-1» і «Фау-2» на Лондан.

Калі парыжане ўзнялі паўстанне, партызанскі атрад «Ягуар» правёў шэраг аперацый на камунікацыях ворага, а затым з французскімі партызанамі 30 жніўня вызваляў горад Муі.

Сотні жыхароў раёна ўзнагароджаны ордэнамі і медалямі СССР. Навечна захаваюць нашчадкі памяць гераічнага подзвігу савецкага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Аб гэтым сведчаць 42 помнікі і абеліскі, устаноўленыя на Хоцімшчыне загінуўшым за Радзіму.

*В.І. Баурына.*

**Баурына, В. І.** Вызваленне / В. І. Баурына // Памяць : гісторыка-дакументальная хроніка Хоцімскага раёна / рэдкалегія: Г. П. Пашков (галоўны рэдактар) [і інш.]. — Мінск, 2003. — Ішла вайна народная. — С. 268.